*Е. А. Угрумава,*
*Н. У. Зарэцкая (Беларусь)*

# СУЧАСНАЯ ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ЮНАЦТВА ЯК СРОДАК САЦЫЯЛІЗАЦЫІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ АПОВЕСЦЕЙ А. БАДАКА, Я. ХВАЛЕЯ, РАМАНА В. ГАПЕЕВА)

Менавіта літаратура адыгрывае важнейшую ролю ў сацыялізацыі асобы, яе станаўленні. Падлеткавы ўзрост вылучаецца асаблівай складанасцю. У гэты перыяд у юнай асобы ўзнікае адчуванне даросласці, жаданне абмежаваць сферы свайго жыцця ад кантролю бацькоў і прымаць рашэнні самастойна. Мастацкая літаратура – сюжэты твораў, іх асобныя эпізоды і канфліктныя сітуацыі – здольны дапамагчы падлетку змадэляваць асабістыя паводзіны, вызначыць жыццёвую пазіцыю, прыняць рашэнне ў пэўнай сітуацыі.

Раман Валерыя Гапеева і аповесці Алеся Бадака і Яўгена Хвалея можна назваць падручнікамі жыцця. На прыкладзе паводзін галоўных герояў-падлеткаў творы вучаць, як важна пражыць першае, чыстае, бескарыснае пачуццё школьнага кахання, не пакрыўдзіўшы нікога. Паколькі кнігі разлічаны на дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту, то праблемы, якія ставяць аўтары, звязаны найперш са сталеннем, першымі крокамі падлеткаў у дарослае жыццё. Самыя актуальныя праблемы, з якімі сутыкаюцца падлеткі-героі аповесцей Я. Хвалея «Прынцэса тусоўкі», А. Бадака «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца» і рамана В. Гапеева «Мая мілая ведзьма», – бацькі і дзеці, першае каханне, школьная наркаманія і таксікаманія, дараванне.

Пісьменнікі пераканаўча паказваюць, як складана выхаваць чалавека маральнага, самастойнага, які з адказнасцю ставіцца да свайго слова і ўчынка ў наш час, калі ў дарослым жыцці, у сем'ях часта сустракаецца чэрствасць і эгаізм, ганарлівасць і халодны разлік. Але, як пераконваюць пісьменнікі, сям'я, школа, дарослыя людзі павінны сеяць і вырошчваць у дзіцячых душах дабрыню, маральнасць, спагаду; дапамагаць падлеткам выбіраць свой жыццёвы шлях, абапіраючыся на агульначалавечыя каштоўнасці і перакананні, не паддавацца ўплыву так званых «тусовак». Ад таго, якімі будуць маладыя пакаленні, як вядома, залежыць будучыня краіны, грамадства, а, магчыма, і чалавецтва.

У працэсе аналізу мастацкіх твораў мы звярнулі ўвагу на вобразы герояў-падлеткаў у творах Я. Хвалея, А. Бадака, В. Гапеева: іх светаадчуванне, характары, душэўныя і духоўныя патрэбы.

У першую чаргу можна ахарактарызаваць асобу падлетка як супярэчлівую. «Я сама сябе часта не разумею. Такая супярэчлівая» [4, с. 240]. Так гаворыць пра сябе Таня Касмылёва ўжо пасля злачынства. Менавіта пра яе Антаніна Фёдараўна гаворыць: «Юны чалавек з неакрэплым характарам і легкадумнымі паводзінамі можа пайсці на ўсё» [4, с. 184]. Такім паўстае перад намі і Вадзім, юнак з добрай сям'і, спартсмен, які даволі лёгка далучаецца да тусоўкі наркаманаў, кідае спартыўную секцыю, пачынае падманваць блізкіх людзей.

Героі-падлеткі валодаюць здольнасцю перажываць глыбокую віну і сорам. Так, Кір з рамана В. Гапеева бясконца перажывае тое, што калісьці перажыла Ядвіся, падаючы з кручы. Перажыванні Сяргея з аповесці А. Бадака – сведчанне жывога сумлення героя, якому так балюча быць заплямленым.

Неаб'ектыўнасць ацэнкі самога сябе – яшчэ адна прыкмета героя-падлетка. Вобраз Кірыла ў рамане В. Гапеева пададзены праз асэнсаванне яго самім юнаком, які трохі камплексуе наконт сваёй асобы. Не раз сустрэнем у рамане самахарактарыстыкі героя накшталт такой: «Не ўмею граць-спяваць-танчыць, не гуляю добра ў футбол-валейбол, не малюю, не пішу рэп, не фатаграфую. Не, не, не… Пра вучобу і казаць няма чаго. Каму я магу быць цікавы – такі вось шэры і ніякі, зусім ніякі?» [3, с. 118].

А ў вобразе Ядвісі, наадварот, падкрэсліваецца ўпэўненасць у сабе і сваіх здольнасцях, незалежнасць, разняволенасць, самастойнасць, адрознасць ад іншых вучаніц класа, выключнасць, якую надае ёй рэпутацыя ведзьмы, простасць і шчырасць у зносінах з людзьмі і нават пэўная грубаватасць.

Жаданне самасцвярджэння, прызнання сябе ў калектыве, павагі да сябе з боку іншых прысутнічае ў многіх падлеткаў-герояў твораў. Гэта і Таня Касмылёва з аповесці Я. Хвалея: «З сённяшняга дня я – каралева… Я люблю ўладу. Любую і над усімі… Дрыжыце, няшчасныя!» [4, с. 116], і Сяргей з аповесці А. Бадака: «Яму хацелася як мага хутчэй даказаць ёй, што ён не такі, як яна пра яго думае. На кожны яе ўрок ён прыходзіў старанна падрыхтаваным, але за месяц яна ні разу яго не выклікала» [2, с. 18].

На жаль, некаторыя з падлеткаў пераймаюць спажывецкую мараль, калі прэстыжным лічыцца мець прыгожую знешнасць, многа грошай, дарагія сучасныя аўто, іншыя матэрыяльныя даброты. Менавіта такімі паказваюцца ў аповесці Я. Хвалея Таня Касмылёва і Анастас (які стаў потым шэфам Дзікам).

Але вельмі важнымі для падлетка, няхай яны гэта не заўсёды паказваюць, з'яўляюцца шчырыя, эмацыянальна блізкія ўзаемаадносіны з бацькамі. «Калі б мая маці так размаўляла са мной, так адносілася да мяне, маё жыццё сёння, магчыма, было б зусім інакшым…» [4, с. 189], – пісала Таня ў лісце да Антаніны Фёдараўны.

Аўтары вяртаюць сваімі творамі чытача да спасціжэння сапраўдных, адвечных ісцін і каштоўнасцей. Прыгожымі павінны быць найперш душы людзей, іх паводзіны. Сённяшнія падлеткі ў даследуемых творах паўстаюць рознымі, як і ў жыцці. Ёсць сярод іх жорсткія, ганарліва-фанабэрыстыя, праз меру

амбітныя, без падстаў на тое… Сродкамі мастацкага слова, праўдзіва, пры дапамозе цікавых сюжэтных аповедаў, аўтары падказваюць сваім чытачам, што толькі высокамаральныя справы і думкі, толькі спачуванне і дапамога таму, хто апынуўся ў бядзе, напаўняюць жыццё кожнага з нас сапраўдным сэнсам.

Звяртаюць на сябе ўвагу і вобразы настаўнікаў, якія абавязкова прысутнічаюць у творах пра школьнае жыццё. Замест правільнага і вытрыманага педагога аўтары стварылі вобраз чалавека з правам на выяўленне пачуццяў. Вучні ў творах ацэньваюць асобу настаўніка, яго знешні выгляд, стасункі з іншымі, яго сям'ю. Гэта, з аднаго боку, паніжае аўтарытэт настаўніка, з другога боку, дазваляе вучню крытычна адносіцца да ўсіх ведаў, атрыманых у школе. Становіцца важным уласнае меркаванне настаўніка, яго асабісты погляд на тыя ці іншыя праблемы.

«Адзін настаўнік даводзіць вучням: вы павінны паважаць сябе, перш за ўсё быць асобаю, развіваць у сабе пачуццё чалавечай годнасці. З гэтага ўрока ідзеш акрылены і адчуваеш сябе чалавекам. Але прыходзіш на другі ўрок, дзе цябе за невыкананне хатняга задання могуць назваць любым словам, нават дэбілам, дзе пастаянна паўтараюць, што ты – нішто» [4, с. 94].

Такіх настаўнікаў, якіх не паважаюць, не любяць, у разгледжаных творах мала. Напрыклад, настаўнік гісторыі Швондзер з рамана В. Гапеева. «Свае сівыя рэдкія валасы ён зачэсвае назад, яны ў яго заўсёды з выгляду мокрыя, рэдкія пасмы зліпаюцца. Твар трохі пакамечаны, як і яго заўсёдны светла-шэры гарнітур. Хіба ён спіць, не распранаючыся? Ды яшчэ пасля добрай папойкі – у яго чырвоная скура… Вочы сядзяць глыбока, як у свінні. Ці не на кожным уроку ўмудраецца крапнуць нам на мазгі: вось у яго маленстве галадалі, камп'ютар не ведалі…» [3, с. 48]. З аднаго боку, выкладчык добра праяўляе сябе як настаўнік-прадметнік. А з другога боку, шмат увагі ён аддае менавіта выхаванню, прычым выхаванню даволі прымітыўнаму і аднабокаму. Акрамя таго, ён абсалютна аўтарытарна адносіцца да мяжы «настаўнік – вучань», не дазваляючы вучням пераступіць яе, жорстка трымаецца сваіх поглядаў.

Ёсць у творах настаўнікі, адносіны вучняў да якіх мяняюцца на працягу твора. Напрыклад, няўдалае асабістае жыццё пэўным чынам уплывае на аўтарытэт класнага кіраўніка ў рамане В. Гапеева. Пазней высвятляецца, што настаўніца не выходзіць замуж з-за хворай маці, яе нярвовасць звязана з неабходнасцю жыць з псіхічна неадэкватным чалавекам. Таму жанчына вымушана сысці з працы, не выходзіць замуж за каханага – настаўніка-фізіка. Завуч з гэтага ж твора, нават калі стала класным кіраўніком, паводзіць сябе як тыповы адміністратар. Яна стараецца не ўступаць з вучнямі ў дыялогі, аддае загады і ацэньвае іх выкананне. Аднак у адзіным эпізодзе яна выходзіць са стану настаўніка-адміністратара ў стан настаўніка-выхавальніка. Галоўны герой Кір пытаецца ў завуча, што яна магла б параіць сабе шаснаццацігадовай. Настаўніца адразу мяняецца, садзіцца побач з вучнямі, шчыра адказвае: «Як педагогу, як завучу школы, мне лепш было казаць вам пра значнасць здаць добра экзамены, пра далейшае абранне шляху, пошукі свайго месца

ў жыцці, выбар прафесіі ўрэшце… Але скажу, калі просіце, як жанчына і маці… Калі абярэш не таго, з кім па жыцціісці, – тады бывае надта балюча і вельмі цяжка» [3, с. 89]. Відаць, што такая трансфармацыя адбываецца дзякуючы ўласным успамінам завуча пра свой падлеткавы ўзрост, яе «ўключэнню» ў падлеткавыя праблемы.

Сапраўднымі настаўнікамі-выхавальнікамі, якія адносяцца да вучняў, да школы з цеплынёй і неабыякавасцю, можна назваць Антаніну Фёдараўну з аповесці Я. Хвалея і дырэктара школы Вольгу Міхайлаўну з аповесці А. Бадака. З вялікім болем успрымае тое, што адбываецца ў яе класе, Антаніна Фёдараўна: «Штосьці зрушылася ў душах у вучняў, нешта не тое адбываецца са школай… Ты можаш днямі і начамі біцца, як аб сцяну, а цябе могуць не пачуць, не зразумець, ці не захацець зразумець. Вось што самае страшнае…» [4, с. 83].

Вобраз маладой настаўніцы біялогіі Танечкі з аповесці А. Бадака стаіць асобна. Менавіта з гэтым вобразам звязана праблема даравання. Нягледзячы на тое, што паводзіны настаўніцы ў творы апраўдваюцца яе маладым узростам і нявопытнасцю як настаўніка, тым не менш разам з аўтарам-апавядальнікам мы здзіўляемся яе адкрытай нянавісці і крыўдзе, пранесеным праз дваццаць гадоў. Ці зможа яна нарэшце пазбавіцца ад разбуральнага пачуцця нянавісці да свайго былога вучня Сяргея, пражыўшы падобную сітуацыю ўжо са сваім уласным сынам? Гэта і іншыя пытанні паўстаюць перад чытачом і прымушаюць задумацца.

Творы, якія знаходзяцца ў цэнтры нашага даследавання, варта папулярызаваць, выносіць для абмеркавання на ўроках пазакласнага чытання, на пазакласных мерапрыемствах, на класных гадзінах. Такія мерапрыемствы (напрыклад, «Суд над Таняй Касмылёвай») прымушаюць вучняў развіваць крытычнае мысленне, бачыць наступствы сваіх дзеянняў, вучыцца на чужых памылках, фарміравацца як сталая асоба, якая апіраецца на агульначалавечыя каштоўнасці і перакананні.

Чытанне такой літаратуры і засяроджаны роздум над прачытаным станоўча ўздзейнічае на фарміраванне душы і розуму сучаснага падлетка, спрыяе яго паспяховай сацыялізацыі.

## Літаратура


1. *Суліма, Г. В.* Асоба сучаснага падлетка ў прозе Валерыя Гапеева / Г. В. Суліма // Літаратура для дзяцей і юнацтва ў кантэксце сучасных адукацыйных і выхаваўчых праблем : матэрыялы Рэсп. навук. канф., Брэст, 13–14 сакав. *2009 г. : у 2 т. – Брэст, 2009. – Т. 2. – С. 116–120.*
2. *Бадак, А.* Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца / А. Бадак. – Мінск : Літ. і мастацтва, 2008. – 176 с.
3. *Гапееў, В.* Мая мілая ведзьма : школьны раман / В. Гапееў. – Мінск : Маст. літ., 2017. – 254 с.
4. *Хвалей, Я.* Прынцэса тусоўкі : аповесці : для сярэд. і ст. шк. узросту / Я. Хвалей. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 366 с.